Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»

Факультэт выдавецкай справы і паліграфіі
Кафедра беларускай філалогіі

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| ________________М.В. Трус | _________________Т.А. Далгова |
| _______________ 2016 г. | _______________ 2016 г. |

ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# «СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

для спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа»

Складальнік: В.У. Русак, ст. выкладчык кафедры беларускай філалогіі

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні Вучэбна-метадычнага савета ад «___»______________ 2016 г.,
пратакол № ___ .

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» з’яўляецца неад’емным элементам падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне выдавецкай справы. Прадыктавана гэта тым, што выкарыстанне беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь ставіць высокія патрабаванні да маўленчай культуры рэдактараў-тэхнолагаў, якія ў сваёй прафесійнай дзейнасці павінны забяспечваць і падтрымліваць афіцыйны статус мовы тытульнай нацыі краіны.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» створаны ў адпаведнасці з тыпавой праграмай, прызначанай для падрыхтоўкі студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа» (№ ТД – I.1262 / тып.; 2015 г.); «Палажэннем аб вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне», зацверджаным рэктарам БДТУ прафесарам І.М. Жарскім (25.08.2014 г.); «Палажэннем аб вучэбна-метадычным комплексе на ўзроўні вышэйшай адукацыі», зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 167 (26. 07. 2011 г.).

ЭВМК па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова», з’яўляючыся інфармацыйным адукацыйным рэсурсам, прызначаным для рэалізацыі патрэб адукацыйнай праграмы і стандарта спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа», забяспечвае ўмовы для эфектыўнай самастойнай работы студэнтаў праз аб’яднанне ўсіх неабходных вучэбных і вучэбна-метадычных матэрыялаў.

Пры распрацоўцы ЭВМК былі ўлічаны вынікі дасягненняў сучаснай філалагічнай навукі, матэрыял выкладзены паслядоўна і лагічна, рэалізуюцца міждысцыплінарныя сувязі. ЭВМК мае сістэмны характар: рашае задачу бесперапыннай адукацыі, абапіраецца на веды і навыкі базавай школы, актуалізуе і істотна ўзбагачае іх фактычным матэрыялам, арыентуецца на фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці будучых рэдактараў-тэхнолагаў.

**Мэта стварэння ЭВМК** «Сучасная беларуская мова» – дапамагчы студэнтам атрымаць цэласнае ўяўленне пра паходжанне і асноўныя этапы развіцця беларускай мовы, яе месца сярод іншых моў свету; дасканала авалодаць усімі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы; навучыцца правільна карыстацца ўсімі сродкамі беларускай мовы ў розных сферах жыццядзейнасці (прафесійнай, бытавой, культурнай).

**Асноўныя задачы стварэння ЭВМК** «Сучасная беларуская мова»:

- арганізацыя эфектыўнай самастойнай працы студэнтаў па засваенні дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» праз укараненне ў навучальны працэс сучасных адукацыйных методык;
- фарміраванне інфармацыйна-камунікатыўнага асяроддзя для ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу праз выкарыстанне сучасных камп’ютарных тэхналогій і сеткі Internet;
- павышэнне якасці падрыхтоўкі студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання спецыяльнасці 1-47 01 01«Выдавецкая справа».

**Структура ЭВМК** «Сучасная беларуская мова». Вучэбна-метадычны комплекс (https://www.belstu.by/faculties/idip/bf/uchebnaya-rabota.html) складаецца з чатырох узаемазвязаных раздзелаў: тэарэтычнага, практычнага, кантролю ведаў і дапаможнага.

У ***тэарэтычны раздзел*** уключаны электронны дапаможнік *Русак В. У. Сучасная беларуская мова: дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці 1 – 47 01 01 «Выдавецкая справа» / В.У. Русак. – Мінск: БДТУ, 2011. – 224 с.*

У ***практычным раздзеле*** змешчаны практычныя заданні, якія могуць быць выкарыстаны як на практычных занятках, так і ў працэсе самастойнай работы. Заданні падаюцца ў адпаведнасці з асноўнымі раздзеламі курса: «Агульныя звесткі пра беларускую мову, яе паходжанне і развіццё», «Фанетыка», «Арфаэпія», «Графіка», «Арфаграфія», «Лексікалогія», «Фразеалогія», «Лексікаграфія», «Марфемная структура слова. Словаўтварэнне», «Марфалогія», «Сінтаксіс і пунктуацыя».

***Раздзел кантролю ведаў*** складаецца з трох частак:

1) кантрольныя пытанні і заданні (па ўсіх пералічаных вышэй раздзелах);

2) кантрольныя тэсты (Тэст 1 «Фанетыка. Арфаэпія. Графіка»; Тэст 2 «Арфаграфія»; Тэст 3 «Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія»; Тэст 4 «Марфемная структура слова. Словаўтварэнне»; Тэст 5 «Назоўнік. Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік»; Тэст 6 «Дзеяслоў і яго формы»; Тэст 7 «Прыслоўе. Безасабова-прэдыкатыўныя і мадальныя словы. Службовыя часціны мовы. Выклічнік»; Тэст 8 «Сінтаксіс і пунктуацыя»);

3) пытанні да экзамену.

***Дапаможны раздзел*** уключае вучэбную праграму дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» для спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа», рэгістрацыйны № УД – 1628-І/р; спіс рэкамендаванай літаратуры.

**Рэкамендацыі па арганізацыі работы з ЭВМК.**

ЭВМК садзейнічае эфектыўнай самастойнай рабоце студэнтаў па засваенні вучэбнага матэрыялу. Комплекс рэкамендавана выкарыстоўваць для арганізацыі ўсіх відаў пазааўдыторнай работы студэнтаў.

| Від работы | Структурныя часткі ЭВМК,<br>якія мэтазгодна выкарыстоўваць |
|---|---|
| Вывучэнне лекцыйных тэм | Электронны дапаможнік (тэарэтычны раздзел ЭВМК); вучэбныя і навуковыя выданні, рэкамендаваныя для азнаямлення (дапаможны раздзел ЭВМК). |
| Пошук даведачнай інфармацыі | Вучэбныя і навуковыя выданні, рэкамендаваныя для азнаямлення (дапаможны раздзел ЭВМК). |
| Падрыхтоўка да практычных заняткаў | Электронны дапаможнік (тэарэтычны раздзел ЭВМК); практычныя заданні (практычны раздзел ЭВМК) |
| Выкананне праверачных і | Электронны дапаможнік (тэарэтычны раздзел ЭВМК); кантрольныя пытанні і заданні, кантрольныя тэсты |

| | |
|---|---|
| кантрольных работ | (раздзел кантролю ведаў ЭВМК); вучэбныя і навуковыя выданні, рэкамендаваныя для азнаямлення (дапаможны раздзел ЭВМК). |
| Падрыхтоўка да экзамену | Электронны дапаможнік (тэарэтычны раздзел ЭВМК); практычныя заданні (практычны раздзел ЭВМК); кантрольныя пытанні і заданні, кантрольныя тэсты, пытанні да экзамену (раздзел кантролю ведаў ЭВМК) |